Уладзімір Караткевіч. Збор твораў. Том 25

АЛФАВІТНЫ ДАВЕДНІК ТВОРАЎ
АЛФАВІТНЫ ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК
УДАКЛАДНЕННІ І ЗНОЙДЗЕНЫЯ НЕДАКЛАДНАСЦІ
ЛЕТАПІС ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА
ПАМЯЦІ АНАТОЛЯ ВЕРАБ'Я

Рэдактар тома
МІХАСЬ КЕНЬКА

Заключны 25 том Збору твораў Уладзіміра Караткевіча складаецца з алфавітнага даведніка па творах, змешчаных ва ўсіх тамах; з алфавітнага імяннога паказальніка, у якім зафіксаваны рэальныя асобы, легендарныя і фальклорныя персанажы, што сустракаюцца ў творах пісьменніка; з удакладненняў і выпраўленняў знойдзеных недакладнасцей. Асноўную частку тома займае Летапіс жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча, складзены даследчыкам жыцця і творчасці пісьменніка Пятром Жаўняровічам.

З «ЛЕТАПІСУ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА»

1930

Лістапад, 26

Нарадзіўся ў горадзе Оршы Віцебскай вобласці ў сям'і Надзеі Васільеўны і Сямёна Цімафеевіча Караткевічаў. *(Пасведчанне аб нараджэнні — ААУК.)*

«Валодзя нарадзіўся ў радзільным доме Оршы. Дарэчы, той будынак захаваўся, і ў ім цяпер — музей Уладзіміра Караткевіча». *(Кучкоўская Н., Шаблінская Г. Юдоль святла // ЖЗЛБ.)*

Жылі па вуліцы Ленінскай, дзе бацькі з 1917-га па 1939 г. здымалі палову

дома № 82. *(Паводле «Юдолі святла».)*

«У сям’і нас было трох. Старэйшы брат (загінуў на апошняй, спадзяюся, што апошняй, вайне), старэйшая сястра і я…

Маці кажа, што чытаць, непрыкметна для іншых, навучыўся ў тры з паловаю гады, а пісаць трохі пазней». *(«Дарога, якую прайшоў» // ЗТ², т. 13.)*

1934

Чэрвень, 28

Нарадзілася ў Кіргізіі, у сям’і вайскоўца родам з Ушаччыны, Валянціна Браніславаўна Ватковіч — будучая жонка У. Караткевіча.

1936

«Пісаць (а спачатку «бубнець») вершы пачаў год у шэсць, але, на шчасце, хутка кінуў гэты занятак. Трохі пазней спрабаваў пісаць апавяданні, прычым абавязкова іх ілюстраваў». (*«Дарога, якую прайшоў».*)

Меркаваны год напісання ліста сям’і Усюкевічаў — роднай цёткы па маці Яўгеніі Васільеўне і яе мужу Уладзіміру Іванавічу. (*Рукапіс — МКГКА.*) НД. Упершыню — ЗТ², т. 19.

1938

Паступіў на вучобу ў 1 клас рускамоўнай сярэдняй школы № 3 горада Оршы. (*Паводле «Юдолі святла».*)

1939

«Уласны дом пабудавалі перад вайной на беразе Дняпра. Цяпер побач з тым месцам у гарадскім аршанскім парку стаіць помнік пісьменніку Уладзіміру Караткевічу». (*«Юдоль святла».*)

1940

Стварыў тры каляровыя малюнкі-мініяцюры, на адной з якіх маецца дароўны надпіс «Тёте Жене от Володи маленького» [маецца на ўвазе Яўгенія

Васільеўна Усюкевіч]. (*Арыгіналы — МКГКА.*) НД. Упершыню — ЗТ[2], т. 18.

1941

Май

Напісаў ліст сям'і Усюкевічаў. *(Рукапіс — МКГКА.)* НД. Упершыню — ЗТ[2], т. 24.

Май, канец месяца

Скончыў тры класы сярэдняй школы.

«…У канцы мая ў Маскву ехала наша знаёмая, з якой бацькі і адправілі Валодзю да мяне» [да сястры Наталлі, якая вучылася ў Маскве ў ВНУ]. (*«Юдоль святла».*)

Чэрвень

«Мы ўжо збіраліся дамоў і нават мелі на руках білеты і ўяўлялі, як тата сустрэне нас на Аршанскім вакзале… Пачалася вайна». (*«Юдоль святла».*)

Ліпень, канец месяца

«…У канцы ліпеня Валодзя паехаў з маскоўскімі дзецьмі ў Разанскую вобласць, а адтуль — у Молатаўскую (Пермскую)». (*«Юдоль святла».*)

«Быў спачатку ў Маскве, потым на Разаншчыне. Пасля давялося ўцякаць і адтуль. На Урал, у наваколле Кунгура». (*«Дарога, якую прайшоў».*)

Лістапад — снежань

Разам з дзецьмі маскоўскага дзіцячага дома апынуўся ў сяле Ленск Кунгурскага раёна Молатаўскай (Пермскай) вобласці. З успамінаў настаўніцы В. В. Бярозкінай: «Неўзабаве ў Ленск прывезлі з Масквы 50 эвакуіраваных дзяцей. Ужо была зіма, дзяцей размясцілі ў старой прыходскай школе, правялі санітарную апрацоўку, вымылі ў лазні…». *(Одегов В. Владимир Короткевич во время войны жил на Урале // «Искра» (Кунгур), 2013, 10 окт.)*

1942

Бацькі, якія эвакуіраваліся ў Чкалаў (Арэнбург), даведаліся праз сваякоў Усюкевічаў (жылі на Далёкім Усходзе) месца знаходжання сына. (*Паводле*

«Юдолі святла».)

Напісаў у Ленску на паштоўцы ліст бацьку ў Чкалаў (Арэнбург). (*Рукапіс — ААУК.*) НД. Упершыню — ЗТ[2], т. 19.

Напісаў у Ленску на паштоўцы ліст маці і бацьку ў Чкалаў (Арэнбург). (*Рукапіс — ААУК.*) НД. Упершыню — ЗТ[2], т. 24.

Даслаў з Ленска ў Арэнбург дзве паштоўкі з малюнкамі. На адвароце адной паштоўкі напісана «Привет из Ленска!» *(Арыгіналы — ААУК.)* НД. Упершыню — ЗТ[2], т. 24.

1943

Жнівень

Старэйшая сястра Наталля з цяжкасцямі дабралася ў Ленск і з такімі ж цяжкасцямі прывезла Уладзіміра ў Чкалаў (Арэнбург). (*Паводле «Юдолі святла».*)

1944

Май

«У Арэнбургу скончыў шосты клас». (*«Дарога, якую прайшоў».*)

Чэрвень — кастрычнік

Пераехаў з маці і жыў у толькі што вызваленым Кіеве ў сям'і Усюкевічаў (Уладзіміра Васільевіча Усюкевіча перавялі з Далёкага Усходу на Заходні фронт і далі кватэру ў сталіцы Украіны). (*Паводле «Юдолі святла».*)

Кастрычнік, сярэдзіна месяца

Вярнуўся з маці ў Оршу. (*Паводле ліста кіеўскага сябра Яўгена Ламакі за 16.05.1946, які пісаў, што развітаўся з Валодзем 14 кастрычніка 1944 г. перад яго ад'ездам. — АРКіР.*)

«Восенню сорак чацвёртага пераехалі на Беларусь». *(«Дарога, якую прайшоў».*). Паступіў у 7 клас сярэдняй школы № 1 горада Оршы.

«І ўсё ж многіх з нас цягнула да вершаў. Столькіх, што мы нават выдалі некалькі нумароў рукапіснага часопіса «Званочак»…

Напісаў я тады, думаю, не менш за дзвесце вершаў, але нікому іх не паказваў. А потым прыйшла настаўніца, якую заўсёды памятаю дабром, — К. І. Грыневіч. І неяк так атрымалася, што ёй некаторыя вершы паказаў. Яны і прыгодніцкая аповесць «Загадка Неферціці» былі «надрукаваны» ў нашым «Званочку». І гэта была адзіная мая «публікацыя» за дзесяць год. Цяпер усё гэта недзе згубілася і шкадаваць аб ім пэўна няма чаго». *(«Дарога, якую прайшоў».*)